Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 263 (332) ПЯТНІЦА 15 ЛІСТАПАДА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫБАРЧЫЯ ЎЧАСТКІ ПЕРАТВАРЫЦЬ У ЦЭНТРЫ ПАЛІТЫЧНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ

Да дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных астаўся адзін месяц. За прайшоўшыя 30 дзён выбарчай кампаніі ў нашай вобласці праробленa вялікая работа. Вылучаны і зарэгістраваны кандыдаты ў абласны і раённыя Советы. Праходзіць рэгістрацыя кандыдатаў у гарадскія Советы, афармляюцца памяшканні выбарчых участкаў.

Тысячы агітатараў шырока разгарнулі на участках масава-палітычную работу. Вывучаецца Сталінская Канстытуцыя і Палажэнне аб выбарах, праводзяцца гутаркі з выбаршчыкамі. Добра арганізавана масава-палітычная работа ў агітакалектыве чыгуначнай станцыі Гродна, дзе на ўчастку працуюць 60 агітатараў. Жыва і змястоўна праходзяць заняткі з хатнімі гаспадынямі па вывучэнню Канстытуцыі СССР, праводзімыя агітатарамі тт. Кузьмянковай, Федазеевым, Горкіным і іншымі. У Беластоку значную работу правялі ўжо агітакалектывы 6-га тэкстыльнага камбіната, Дзяржбанка і іншых прадпрыемстваў і ўстаноў. Агітатары Дзяржбанка арганізавалі на сваім участку 27 гурткоў па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Сталінскай Канстытуцыі. Агітатар 6-га камбіната тав. Дзінабургская кіруе гуртком хатніх гаспадынь аднаго квартала на вуліцы Катоўскага. Заняткі яна праводзіць рэгулярна ў кожны панядзелак.

Зроблена нямала. Але-ж упарадзе прадстаіць зрабіць значна больш. Неабходна дабіцца таго, каб усе выбаршчыкі дэтальна вывучылі Палажэнне аб выбарах і Сталінскую Канстытуцыю, каб кожны выбаршчык ведаў сваіх кандыдатаў у дэпутаты. Вось чаму ў другой палове выбарчай кампаніі партыйныя арганізацыі вобласці павінны галоўную ўвагу ўдзяліць агітацыйнай рабоце на ўчастках. Выбарчыя ўчасткі трэба ператварыць у сапраўдныя цэнтры палітычна-масавай работы!

У рашэннях бюро абкома, а таксама на нарадах сакратароў і загадчыкаў аддзелаў агітацыі і прапаганды гаркомаў і райкомаў намечана рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да выбараў. Але не ўсюды па-бальшавіцку ўзяліся за выкананне намечаных мерапрыемстваў, за арганізацыю дастойнай сустрэчы дня выбараў — 15 снежня.

Асобныя райкомы КП(б)Б слаба кіруюць выбарчай кампаніяй. Такое становішча назіраецца ў Монькаўскім райкоме. У радзе сельсоветаў зусім не пачыналася агітацыйная работа. У Кнышынскім пасялковым Совеце вылучана 25 агітатараў, але да работы з іх яшчэ ні адзін не прыступіў. Не створана ні аднаго гуртка па вывучэнню Палажэння аб выбарах. Такі малюнак мы бачым і ў Хайноўскім сельсовеце. Ніхто з 21 агітатара не прыступіў да работы на ўчастках.

Не лепш праходзіць падрыхтоўка да выбараў у Цеханавецкім раёне. Тут на працягу першага месяца выбарчай кампаніі займаліся толькі арганізацыйнымі пытаннямі: стварылі акругі, участкі, укамплектавалі выбарчыя камісіі і т. д. Агітацыйнай работай меркавалі заняцца толькі... пасля выканання ўсіх арганізацыйных задач. У выніку атрымаўся поўны разрыў паміж арганізацыйнай і агітацыйнай работай. Аддзел прапаганды і агітацыі да апошніх дзён стаяў у баку ад кіраўніцтва агітакалектывамі раёна, інструктары аддзела былі замацаваны за асобнымі сельсоветамі ў якасці так званых упаўнаважаных райкома.

Недапушчальна марудна разгортваецца агітацыйна-масавая работа ў многіх пярвічных арганізацыях Беластока. Менш 10 агітатараў прыступілі да работы на ўчастку ў агітакалектыве тэкстыльнага камбіната № 1, у саставе якога налічваецца 62 чалавекі. Не ўсе агітатары пачалі работу на ўчастках з партыйных арганізацый упраўлення чыгункі, аблвыканкома і т. д.

Партыйныя арганізацыі нашай вобласці павінны неадкладна прыняць усе меры, каб у самыя бліжэйшыя дні ліквідаваць маючыяся недахопы і па-бальшавіцку разгарнуць работу на выбарчых участках. Агітацыя за кандыдатаў, растлумачэнне Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах, шырокая папулярызацыя дасягненняў Совецкага Саюза,—уся палітычна-масавая работа павінна быць сканцэнтравана на выбарчых участках. Пры растлумачэнні Палажэння аб выбарах неабходна сур'ёзную ўвагу звярнуць на раздзел аб спісках выбаршчыкаў. Гэтым самым агітатары дапамогуць гарадскім і раённым выканаўчым камітэтам, сельсоветам і выбарчым камісіям уключыць у спіскі выбаршчыкаў усіх грамадзян, маючых права голасу. Ні адзін выбаршчык не павінен адсутнічаць у спісках!

Палітычная агітацыя на ўчастках павінна быць канкрэтнай і пераканаўчай. Для гэтага трэба шырока карыстацца мясцовымі фактамі. На прыкладах жыцця свайго горада, свайго раёна, сяла, фабрыкі і т. д. паказваць нашы дасягненні.

Агітатары павінны шырока папулярызаваць дасягненні нашай вобласці, горада, раёна, сяла, прадпрыемства. А дасягненні гэтыя вельмі вялікія. Працоўныя нашай вобласці штодзённа адчуваюць іх у сваім новым жыцці. Яны карыстаюцца ўсімі дабротамі, запісанымі ў Сталінскай Канстытуцыі. Кожны мае права на працу, на адпачынак, на асвету і т. д. У Беластоку, напрыклад, колькасць навучаючыхся павялічылася на 45 процантаў. Асабліва прыкметныя змяненні назіраюцца ў Беластоку ў матэрыяльна-бытавым становішчы працоўных. Зарплата рабочых павялічылася ў два разы, спажыванне электраэнергіі павялічылася ў 3 разы. Да небывалых размераў узрос тавараабарот горада. Толькі ў адным трэцім квартале прадана тавараў на 93,9 мільёна рублёў. З 15 кастрычніка па 1 лістапада аднаго цукру прадана насельніцтву 510 тон — амаль па 5 кілаграмаў на душу.

Адказныя, пачотныя задачы прадстаіць ажыццявіць у астаўшыяся перыядзе выбарчай кампаніі. І калі партыйныя арганізацыі правільна, па-бальшавіцку арганізуюць сваю работу, калі асноўная палітычна-масавая работа будзе перанесена на ўчастак, гэтыя задачы, безумоўна, будуць вырашаны з поспехам.

НАРАДА САКРАТАРОЎ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ гор. БЕЛАСТОКА

12 лістапада Беластоцкі гарком КП(б)Б правёў нараду сакратароў пярвічных партарганізацый горада. На нарадзе абмеркаваны дырэктывы ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Выступіўшыя ў спрэчках сакратары партарганізацый ускрылі рад недахопаў у рабоце па правядзенню выбарчай кампаніі.

— Горвыканкомам фармальна аднёсся да адвядзення памяшканняў пад выбарчыя ўчасткі,—гаварыць сакратар партарганізацыі 24-й тэкстыльнай фабрыкі.—Камісія выбарчага ўчастка № 8 размясцілася ў чырвоным кутку 24-й фабрыкі. Тут-жа развешаны спіскі і 7-га ўчастка.

Аб падобных фактах гаварыў сакратар пярвічнай партарганізацыі ўпраўлення лесааховы і лесанасаджэння тав. Панамарэнка.

Таварышы Маскалёў, Стрыкаў і іншыя таксама ўказалі на рад істотных недахопаў. Назіраюцца вялікія пропускі ў спісках выбаршчыкаў. Многія агітакалектывы яшчэ не разгарнулі на ўчастках агітацыйна-масавай работы.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

16 лістапада, у 8 гадзін вечара, у памяшканні Дома партыйнай асветы адбудзецца сход беластоцкага гарадскога партыйнага актыва.

Уваход па пропусках. Пропускі выдаюцца сакратарамі пярвічных партарганізацый.

БЕЛАСТОЦКІ ГАРКОМ КП(б)Б.

Прыём у Гітлера ў чэсць таварыша В. М. Молатава

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Сёння ў 14 гадзін па берлінскаму часу рэйхсканцлер Германіі Гітлер наладзіў сняданне ў чэсць Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава.

Таварыш Молатаў выехаў у 13 гадзін 45 мінут з палаца Бельвю ў імперскую канцылярыю ў суправаджэнні загадчыка пратакольным аддзелам германскага міністэрства замежных спраў п. Дэрнберга. Часці германскай арміі і атрады асабістай аховы Гітлера, выстраеныя ля пад'езду імперскай канцылярыі, аказалі таварышу Молатаву воінскія почасці.

Разам з таварышам Молатавым на сняданні прысутнічалі: Народны Камісар чорнай металургіі тав. Тэвасян, Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Дэканозаў, Намеснік Народнага Камісара Унутраных Спраў тав. Меркулаў, Намеснік Народнага Камісара Знешняга Гандлю тав. Круцікаў, намеснікі Народнага Камісара авіяцыйнай прамысловасці тт. Баладзін і Якаўлеў, загадчык пратакольным аддзелам Народнага Камісарыята Замежных Спраў тав. Баркоў, паўнамоцны прадстаўнік СССР у Германіі тав. Шкварцаў, першы сакратар паўнамоцнага прадстаўніцтва тав. Паўлаў.

З германскага боку прысутнічалі: міністр замежных спраў п. фон Рыбентроп, кіраўнік вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл Германіі генерал-фельдмаршал Кейтэль, імперскі міністр доктар Гебельс, кіраўнік германскага працоўнага фронта доктар Лей, начальнік аддзела друку германскага ўрада доктар Дзітрых, відныя дзеячы нацыянал-сацыялісцкай партыі Борман, начальнік асабістай канцылярыі Гітлера доктар Мейснер, германскі пасол у Маскве п. фон Шуленбург, начальнік асабістай аховы Гітлера п. Зеп Дзітрых, ад'ютанты Гітлера Шауб і палкоўнік Шмундт, загадчык пратакольным аддзелам міністэрства замежных спраў Дэрнберг, пасланнік Гевель, саветнік германскага пасольства ў Маскве Гільгер.

Другая гутарка паміж п. Гітлерам і таварышам Молатавым

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Сёння ў другой палове дня ў памяшканні новай імперскай канцылярыі адбылася другая гутарка паміж рэйхсканцлерам Германіі Гітлерам і Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышам В. М. Молатавым. У час гутаркі прысутнічалі міністр замежных спраў Германіі п. фон Рыбентроп і Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў СССР тав. В. Г. Дэканозаў.

Гутарка працягвалася звыш трох гадзін.

Вячэра ў паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Берліне ў чэсць Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава

БЕРЛІН, 13 лістапада. (ТАСС). Сёння ў 7 гадзін вечара ў паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Берліне была дадзена вячэра ў чэсць Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В. М. Молатава. На вячэры прысутнічалі таварыш В. М. Молатаў, Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Дэканозаў, паўнамоцны прадстаўнік СССР у Германіі тав. Шкварцаў, Народны Камісар чорнай металургіі тав. Тэвасян, Намеснік Народнага Камісара Унутраных Спраў тав. Меркулаў, Намеснік Народнага Камісара Знешняга Гандлю тав. Круцікаў, намеснікі Народнага Камісара авіяцыйнай прамысловасці тт. Баладзін і Якаўлеў, загадчык Пратакольным аддзелам Народнага Камісарыята Замежных Спраў тав. Баркоў і іншыя суправаджаючыя таварыша В. М. Молатава асобы, а таксама супрацоўнікі паўнамоцнага прадстаўніцтва і гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Берліне.

З германскага боку на вячэры прысутнічалі: міністр замежных спраў п. фон Рыбентроп, начальнік германскай паліцыі п. Гімлер, рэйхсміністр п. Ламерс, міністр узбраенняў і боепрыпасаў п. Тодт, кіраўнік германскага працоўнага фронта доктар Лей, начальнік аддзела друку германскага ўрада доктар Дзітрых, пасланнік Шмідт.

Заключная гутарка паміж таварышам Молатавым і п. фон Рыбентропам

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). 13 лістапада ўвечары паміж Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў таварышам В. М. Молатавым і міністрам замежных спраў Германіі п. фон Рыбентропам адбылася заключная гутарка.

Ад'езд Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў таварыша В.М. Молатава з Берліна

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). Сёння, пасля двухдзённага прабывання ў Берліне, выехаў у Маскву Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш В. М. Молатаў. Разам з ім выехалі ў Маскву Нарком чорнай металургіі тав. Тэвасян І. Т., Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Дэканозаў В. Г. і іншыя суправаджаючыя таварыша Молатава асобы.

У Маскву таксама выехалі германскі пасол у СССР фон дэр Шуленбург і паўнамоцны прадстаўнік СССР у Германіі тав. Шкварцаў.

У 11 гадзіне раніцы па берлінскаму часу германскі міністр замежных спраў п. фон Рыбентроп выехаў за таварышам Молатавым у замак Бельвю для таго, каб праводзіць яго на Ангальцкі вакзал.

Правады таварыша Молатава прайшлі ва ўрачыстай абстаноўцы. Ангальцкі вакзал быў упрыгожан зеленню і кветкамі. Ля галоўнага ўваходу былі вывешаны дзяржаўныя флагі СССР і Германіі. На прывакзальнай плошчы ў чэсць таварыша Молатава была выстраена рота пачотнай варты. Таварыш Молатаў разам з п. фон Рыбентропам прайшлі ўздоўж фронта пачотнай варты.

Для праводу з германскага боку, апрача п. фон Рыбентропа прыбылі імперскі міністр доктар Ламерс, начальнік германскай паліцыі п. Гімлер, кіраўнік германскага працоўнага фронта доктар Лей, начальнік аддзела друку пры германскім ўрадзе доктар Дзітрых, статс-сакратары міністэрства замежных спраў фон Вейцзекер, Боле і Кеплер, пасол Рытэр, намеснік Гімлера генерал Далюге, генерал Томас, які прадстаўляў генерал-фельдмаршала Кейтэля, камендант Берліна генерал-лейтэнант Зейферт, бургамістр Берліна Штээх, пасланнікі Альтэнбург, фон Твардоўскі, Лютнер, фон Рынтэлен, Гевель, кіраўнік аддзела друку міністэрства замежных спраў Шміт і прадстаўнікі друку.

Таварыша Молатава праводзілі таксама супрацоўнікі паўнамоцнага прадстаўніцтва і гандлёвага прадстаўніцтва СССР у Берліне, з якімі таварыш Молатаў цёпла развітаўся.

Падзякаваўшы п. фон Рыбентропа за аказаны прыём, таварыш Молатаў развітаўся з праводзіўшымі яго прадстаўнікамі германскага ўрада.

У 11 гадзін па берлінскаму часу поезд адышоў ад перона вакзала.

Камюніке аб перагаворах Старшыні Соўнаркома СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. Молатава з кіраўнікамі германскага ўрада

У час прабывання ў Берліне на працягу 12—13-га лістапада гэтага года Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў меў гутарку з рэйхсканцлерам п. А. Гітлерам і міністрам замежных спраў п. фон Рыбентропам. Абмен думак праходзіў у атмасферы ўзаемнага давер'я і ўстанавіў узаемнае разуменне па ўсіх важнейшых пытаннях, якія цікавяць СССР і Германію.

Тав. В. М. Молатаў меў таксама гутарку з рэйхсмаршалам п. Герынгам і намеснікам п. Гітлера па партыі нацыянал-сацыялістаў п. Гесам.

14 лістапада раніцой Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў выехаў у Маскву.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных

ІВАН АНТОНАВІЧ ТУРЛЕЙСКІ

Акруговая выбарчая камісія Ломжынскай Паўднёва-Усходняй выбарчай акругі № 15 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных па Ломжынскай Паўднёва-Усходняй выбарчай акрузе № 15 тав. Турлейскага Івана Антонавіча, 1913 года нараджэння, паляка, ураджэнца г. Лодзі, з рабочых-чыгуначнікаў. З 1931 года прымаў удзел у падпольных гуртках. У 1934 годзе быў сакратаром агульнаваршаўскай студэнцкай камсамольскай арганізацыі. У 1936 годзе ўступіў у члены КПЗБ. З 1936 года за выступленне і арганізацыю першамайскай дэманстрацыі ў г. Ломжы быў арыштаван і прыгавораны да двух год турэмнага зняволення, працуе старшынёй Ломжынскага горвыканкома, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

ФІЛІП ІОСІФАВІЧ ПАПОЎ

Акруговая выбарчая камісія Ломжынскай Паўночнай выбарчай акругі № 16 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных па Ломжынскай Паўночнай выбарчай акрузе № 16 тав. Папова Філіпа Іосіфавіча, 1902 года нараджэння; рускі, з сялян, член ВКП(б) з 1926 года, працуе другім сакратаром Беластоцкага абкома КП(б)Б.

ФРАНЦІШАК ПЯТРОВІЧ БАРАЎСКІ

Акруговая выбарчая камісія Ломжынскай Заходняй выбарчай акругі № 17 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных па Ломжынскай Заходняй выбарчай акрузе № 17 Бараўскага Францішка Пятровіча, 1909 года нараджэння, паляка, беспартыйнага, з рабочых. З 1926 года працуе на Ломжынскім заводзе сельскагаспадарчых машын, майстар ліцейнага цэха.

НІКІТА ПЯТРОВІЧ ШАХ

Акруговая выбарчая камісія Аўгустоўскай Сельскай выбарчай акругі № 19 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных па Аўгустоўскай Сельскай выбарчай акрузе № 19 тав. Шаха Нікіту Пятровіча, 1897 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню Аўгустоўскага райвыканкома.

ІОСІФ МАРКАВІЧ ШЧУКІН

Акруговая выбарчая камісія Барглоўскай выбарчай акругі № 20 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных па Барглоўскай выбарчай акрузе № 20 тав. Шчукіна Іосіфа Маркавіча, 1902 года нараджэння, члена ВКП(б), начальніка 1-га аддзялення аддзела палітычнай прапаганды пагранічных войск НКВД БССР.

АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ АКУЛІЧ

Акруговая выбарчая камісія Харашчанскай выбарчай акругі № 22, Беластоцкага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Акуліча Аляксандра Фёдаравіча, 1902 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню Беластоцкага райвыканкома.

МІХАІЛ АЛЯКСАНДРАВІЧ ГАЛІЦКІ

Акруговая выбарчая камісія Бацечкаўскай выбарчай акругі № 24, Беластоцкага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Галіцкага Міхаіла Аляксандравіча, 1880 года нараджэння, беспартыйнага, селяніна вёскі Копіск, Беластоцкага раёна.

КАЗІМІР ФЕЛІКСАВІЧ ВІШНЕЎСКІ

Акруговая выбарчая камісія Супраслеўскай выбарчай акругі № 25 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Вішнеўскага Казіміра Феліксавіча, 1897 года нараджэння, беспартыйнага, рабочага Супраслеўскага тэкстыльнага камбіната № 7.

АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ МУРАЎСКІ

Акруговая выбарчая камісія Бранскай выбарчай акругі № 27 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Мураўскага Аляксандра Іванавіча, 1901 года нараджэння, беспартыйнага, старшыню Бранскага гарадскога пасялковага совета.

АЛЯКСАНДР ФЁДАРАВІЧ САЗОНАЎ

Акруговая выбарчая камісія Граеўскай выбарчай акругі № 39 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Сазонава Аляксандра Фёдаравіча, 1903 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню абласной планавай камісіі.

ІОСІФ СТАНІСЛАВАВІЧ НЯДЗВЕЦКІ

Акруговая выбарчая камісія Белдоўскай выбарчай акругі № 40, Граеўскага раёна, зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Нядзвецкага Іосіфа Станіслававіча, 1904 года нараджэння, члена ВКП(б), старшыню Граеўскага райвыканкома.

КАНСТАНЦІН ІЛЬІЧ ГОВАР

Акруговая выбарчая камісія Індурскай выбарчай акругі № 41 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Говара Канстанціна Ільіча, 1908 года нараджэння, беспартыйнага, старшыню калгаса імені 17 верасня.

МІХАІЛ АРСЕНЬЕВІЧ ФОМІЧАЎ

Акруговая выбарчая камісія Багушэўскай выбарчай акругі № 42 зарэгістравала для балатыроўкі ў абласны Совет дэпутатаў працоўных тав. Фомічава Міхаіла Арсеньевіча, 1909 года нараджэння, члена ВКП(б), батальённага камісара, Героя Совецкага Саюза.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ БЕЛАСТОЦКАГА АБЛАСНОГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Ленінскай выбарчай акругі № 1 горада Беластока! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Генрыха Фларэнцінавіча ФЕРЭНЦОВІЧА!

★ ★ ★

Генрых Фларэнцінавіч Ферэнцовіч

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

На мітынгу ў педінстытуце, калі вылучалі кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета, слова папрасіў праф. Любельскі.

— Калі ад нашага інстытута,— сказаў ён, — трэба вылучыць самага лепшага, самага дастойнага кандыдата ў органы совецкай улады, то такой кандыдатурай з'яўляецца ўсімі намі паважаны дацэнт Генрых Фларэнцінавіч Ферэнцовіч. Гэта будзе самы ўдачны выбар.

І перапоўнены зал горача апладыраваў. Чаму? Чым заслужыў тав. Ферэнцовіч такое давер'е і чэсць— быць пасланцом народа ў органы совецкай улады? Чэснае жыццё і адданая праца Генрыха Фларэнцінавіча на карысць народнай асветы з'яўляюцца адказам на гэтае пытанне.

* * *

Генрых Ферэнцовіч нарадзіўся ў 1904 годзе ў сям'і польскага чыноўніка горнай прамысловасці, які выконваў чарцяжы для цынкавых шахт. Дзяцінства Генрых правёў у Ольхушскім павеце, Келецкага ваяводства. У 1922 годзе скончыў сярэднюю школу ў Чэнстахове. Але лёгка сказаць — скончыў. Трэба ведаць, з якімі матэрыяльнымі цяжкасцямі сустрэўся юнак, навучаючыся ў сярэдніх і старшых класах гімназіі. К гэтаму часу ён страціў бацькоў і поўнасцю быў прадастаўлен сам сабе. Зарабляючы на пражыццё, гімназіст Генрых даваў прыватныя ўрокі, рэпетыраваў тупаватых барчукоў.

Яшчэ ў гімназіі Генрых Ферэнцовіч палюбіў фізіку і рашыў ёй прысвяціць сваё жыццё. У 1923 годзе яму ўдаецца паступіць на фізіка-матэматычны факультэт Варшаўскага універсітэта. Але малады студэнт не мог поўнасцю аддацца любімай навуцы. Трэба было зарабляць на пражыццё і на плату за навучанне. І Генрых Ферэнцовіч працуе настаўнікам пачатковай школы. Абавязкі настаўніка настолькі перашкаджалі вучобе ва універсітэце, што 4-гадовы курс абучэння Генрыху Ферэнцовічу ўдалося скончыць толькі за 9 год.

Там, ва універсітэце, сфарміраваўся светапогляд тав. Ферэнцовіча. Сумяшчэнне вучобы і педагагічнай работы прывучыла яго да выключнай дысцыпліны, да напорыстасці ў рабоце.

Атрымаўшы атэстат выкладчыка сярэдняй школы, Генрых Ферэнцовіч у 1932 годзе прыехаў у Беласток. З гэтага часу пачынаецца яго плённая работа ў галіне асветы.

Генрых Ферэнцовіч належыць да тых людзей навукі, якія не спыняюцца на дасягнутым, не пры-



трымліваюцца ўстанавіўшыхся, агульнапрызнаных, але ўстарэўшых традыцый, а смела ламаюць іх, шукаюць новыя шляхі і ўпэўнена рухаюць уперад навуку. Калі Ферэнцовіч прыступіў да работы ў Беластоку, у сярэдніх школах выкладанне фізікі вялося схаластычна, толькі вусна, адарвана ад жыцця і практыкі. На ўроках фізікі амаль не практыкаваліся доследы, школа не давала практычных навыкаў. І Генрых Ферэнцовіч смела становіцца на шлях ломкі ўстанавіўшыхся традыцый. Перамагаючы коснасць і ўсемагчымыя перашкоды, ён абсталёўвае пры гімназіі і ліцэі фізічную лабараторыю. На ўроках ён уводзіць элемент самастойных, практычных работ над прыборамі, прывучае вучняў прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы.

Генрых Фларэнцінавіч слыў у Беластоку лепшым фізікам-метадыстам, прымаў актыўны ўдзел у рабоце «Огніска» (метадычнае аб'еднанне выкладчыкаў фізікі). На пасяджэннях «Огніска» ён горача адстойваў новыя метады выкладання. У галіне методыкі выкладання фізікі Генрых Фларэнцінавіч прарабіў вялікую прапрэсіўную работу. Ён напісаў цэлы рад метадычных распрацовак, якія карэнным чынам адрозніваліся ад агульнапрызнаных у Польшчы.

З устанаўленнем совецкай улады ў Беластоку Генрых Фларэнцінавіч горача ўключыўся ў арганізацыю першай у гісторыі горада вышэйшай навучальнай установы — педагагічнага інстытута. Ён быў першым з мясцовых педагогаў, якога зацвердзілі выкладчыкам у інстытуце. З сапраўдным творчым запалам працуе Генрых Фларэнцінавіч над стварэннем фізічнай лабараторыі, над абсталяваннем яе неабходнымі прыборамі.

Гэта была не лёгкая задача. Але Ферэнцовіч не спалохаўся цяжкасцей. З уласцівай яму настойлівасцю ён бліскуча справіўся з пастаўленай задачай. Дні і ночы праводзіў ён разам з асістэнтам — сваім былым вучнем Літвіновічам— у фізічнай лабараторыі, дасканала афармляючы кожную тэму. І вось зараз лабараторыя гатова. Студэнты фізмата штодзённа працуюць у ёй па дзве гадзіны.

Генрых Фларэнцінавіч — чалавек строгай працоўнай дысцыпліны. Такой дысцыпліны ён патрабуе і ад сваіх студэнтаў. Лабараторныя работы, якія карыстаюцца вялікім інтарэсам у студэнтаў, выконваюцца заўсёды акуратна, дакладна, чотка.

Зараз Генрых Фларэнцінавіч марыць аб тым, каб абсталяваць яшчэ тры фізічных лабараторыі: па цеплатэхніцы, электрычнасці і оптыцы, а таксама гукавую кіноўстаноўку.

Тав. Ферэнцовіч выкладае фізіку на фізіка-матэматычным факультэце. Дэтальна, глыбока рыхтуецца ён да сваіх лекцый, яны праходзяць на высокім навуковым узроўні.

Калі тав. Ферэнцовіч паказвае сваю лабараторыю, яго твар святлее. Гэта яго стыхія. Але за мікраметрамі, кандэнсатарамі, маятнікамі, манометрамі не цяжка разглядзець воблік грамадзяніна, совецкага вучонага — скромнага, чэснага працаўніка, які не шкадуе сваіх сіл для росквіту навукі, на дабро сваёй маці-радзімы.

Работа дэпутатам абласнога Совета дэпутатаў працоўных, безумоўна, уцягне Генрыха Фларэнцінавіча ў грамадскае жыццё, зробіць яго не толькі вучоным, але і дзяржаўным дзеячом.

Ал. Нёманскі.

Выбаршчыкі Пякуцкай выбарчай акругі № 28, Бранскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Аляксея Фядосьевіча КУЛІКАВА!

★ ★ ★

Аляксей Фядосьевіч Кулікаў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Калгаснікі калгаса імені Дзержынскага, Топчаўскага сельсовета, рабочыя соўгаса Каменны Двор і сяляне вёскі Астраносцы, Бранскага раёна, на сваіх сходах вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных тав. Кулікава Аляксея Фядосьевіча — загадчыка абласным фінансавым аддзелам.

Сяляне вёскі Астраносцы гаварылі на сходзе:

Мы ведаем тав. Кулікава як адданага і стойкага работніка, які цвёрда і правільна праводзіць у сваёй рабоце палітыку совецкай улады. Лічым, што вылучаны намі кандыдат тав. Кулікаў апраўдае наша вялікае давер'е.

Тав. Кулікаў сам не любіць гаварыць пра сябе, скромна заяўляючы:

— Ніякіх асаблівасцей у мяне няма, стараюся найбольш правільна выканаць дырэктывы комуністычнай партыі і совецкага ўрада.

А правільна выконваць, ажыццяўляць дырэктывы партыі і ўрада, якія цалкам накіраваны на паляпшэнне жыцця нашага народа, на ўмацаванне соцыялістычнай радзімы, гэта і ёсць лепшая якасць большэвіка. Тав. Кулікаў не можа быць інакшым, бо ён выйшаў з гушчы працоўнага народа, яго выхавала большэвіцкая партыя.

Аляксей Фядосьевіч Кулікаў нарадзіўся ў 1903 годзе ў мястэчку Копысь, Аршанскага раёна, Віцебскай вобласці. Шэрае і беднае было гэта мястэчка на Дняпры, цяжка жыў працоўны люд. Бацька Аляксея быў рабочы, 35 год працаваў на кафельным заводзе фармоўшчыкам. Малому Аляксею скора прыйшлося пайсці зарабляць у дапамогу бацьку. Працоўны шлях Аляксея Кулікава пачаўся з пагоншчыка коней пры глінамяшалцы.

У імперыялістычную вайну спыніўся кафельны завод. Бацька Кулікава паступіў працаваць на чыгунку, дзе быў забіты пры крушэнні поезда. Асталася сям'я з пяці душ без кармільца, а самаму старэйшаму з дзяцей—Аляксею— было 14 год. Маці паступіла працаваць прыбіральшчыцай, Аляксей — на пякарню. Цяжка было пражыць, а Аляксей хацеў вучыцца. Сяк-так скончыў школу другой ступені — гэта было ўжо ў 1920 годзе, пры совецкай уладзе. Па таму часу гэта была сярэдняя асвета. Тады ў валасным совеце юнаму Кулікаву прапанавалі заняць пасаду настаўніка сельскай школы. З радасцю ўзяўся ён за справу асветы вясковых дзяцей.

У 1922 годзе 19-гадовага Залі-



кава, як сына рабочага і як настаўніка, прынялі ў рады комуністычнай партыі. Гэта было вялікай падзеяй у яго жыцці. Тав. Кулікава пасылаюць на тыя ўчасткі, дзе патрэбны надзейныя людзі. Так ён працуе сакратаром народнага суда, затым у ахове будаўніцтва чыгункі, а ў 1924 годзе Аршанскі павятовы камітэт партыі пасылае яго ў распараджэнне павятовага фінансавага аддзела. З таго часу па сённяшні дзень ён працуе на гэтым важнейшым участку.

У 1929 годзе тав. Кулікаў, як лепшы работнік, быў паслан на фінансавыя курсы ў Ленінград. Па сканчэнні курсаў працаваў загадчыкам раённых фінаддзелаў у Крупках і Асвеі. У 1934 годзе тав. Кулікава камандыруюць на вучобу ў Ленінградскую фінансавую акадэмію, якую ён скончыў праз тры годы з адзнакай. ЦК ВКП(б) паслаў яго на работу ў Наркамфін Таджыкскай ССР. З Таджыкістана тав. Кулікаў па накіраванню Наркамфіна СССР прыехаў у БССР. Наркамфін БССР назначыў яго загадчыкам Беластоцкага аблфінаддзела, дзе ён працуе з мая месяца.

За кароткі час прыйшлося правесці вялікую работу па наладжванню фінансавай гаспадаркі ў вобласці. Трэба было прывучыць людзей да захавання цвёрдай фінансавай дысцыпліны, сачыць, каб кожны народны рубель правільна і эфектыўна скарыстоўваўся гаспадарчымі органамі, каб сродкі выдаткоўваліся толькі па прамому прызначэнню дзяржавы.

Трэба было навесці большэвіцкі парадак і ва ўласным апараце. Аблфінаддзел прыйшлося ачысціць ад людзей, не здольных чэсна праводзіць совецкую фінансавую палітыку, падабраць кадры чэсных людзей. Вельмі многа зроблена для ўкамплектавання кадрамі раённых фінаддзелаў з ліку чэсных, правераных мясцовых людзей, адданых совецкай уладзе.

Разам з гэтым трэба змагацца за выкананне дзяржаўнага плана мабілізацыі сродкаў на соцыялістычнае будаўніцтва. І наша вобласць мае ў гэтым немалыя поспехі. За другі і трэці кварталы гэтага года фінплан выканан з перавышэннем. З усіх 127 абласцей Саюза Беластоцкая вобласць выйшла на пятае месца. Гэта патрабавала вялікай упорнай работы фінорганаў і самога загадчыка аблфінаддзела тав. Кулікава.

Перадавым у вобласці па выкананню фінплана ідзе Бранскі раён. Аблфінаддзел выдаў раёну прэмію — 20 тысяч рублёў на сканчэнне будаўніцтва гарадскога кінотэатра. Зараз Бранск мае добры, прыгожы кінотэатр.

Працоўныя Бранскага раёна добра ведаюць тав. Кулікава. Вось чаму, калі выбаршчыкі 28-й Пякуцкай выбарчай акругі, Бранскага раёна, вылучалі ад сваёй акругі кандыдата ў дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных, яны назвалі тав. Кулікава, ахарактарызаваўшы яго як энергічнага працаўніка. Высокае давер'е народа з'яўляецца найвялікшай чэсцю для большэвіка. І тав. Кулікаў па-большэвіцку апраўдае народнае давер'е.

І. Клінаў.

Напярэдадні 30-годдзя з дня смерці Л. Н. Талстога

АПОШНІЯ ДНІ Л. Н. ТАЛСТОГА

Адчынілася фортачка. Чыйсьці рыдаючы голас сказаў:

— Памёр!

Стаяўшыя ля доміка знялі шапкі. Хтосьці пакачнуўся. Яго падхапілі і ўвялі ў дом.

Было 6 гадзін 5 мінут раніцы. На двары стаяла глухая, сумная восень. У прадранішняй, шэрай, пранізваючай імгле трывожна чарнелі цені. Ад доміка да вакзальнай платформы спяшаючыся прабег чалавек. Аднекуль, нібы з-пад зямлі, выраслі фігуры жандараў. У дзяжурным пакоі затрашчаў званок. Станцыйны тэлеграфіст дрыжачым голасам чытаў толькі што паданы яму тэлеграфны бланк: «Закацілася сонца свету! Дагарэла прыгожае жыццё! Расія страціла найвялікшага сына, свет страціў найвялікшага грамадзяніна!»

...Мы стаім у пакоі старадаўняга яснапалянскага дома і слухаем усхваляваны расказ аднаго з старэйшых жыхароў сядзібы Сергея Іванавіча Шчэголева.

...У лістападаўскую цёмную і халодную ноч вялікі пісьменнік вышаў з свайго дома, у якім пражыў больш 70 год. Вышаў назаўсёды. Праз некалькі дзён яго прывезлі сюды ў запаянай труне...

Мноства кніг, дзённікаў, успамінаў прысвечана гэтай падзеі. Трэба аддаць справядлівасць кіраўнікам яснапалянскага музея-сядзібы: яны сумелі падабраць нямала дакументаў, якія дапамагаюць узнавіць у памяці ўсю карціну ўходу і смерці вялікага пісьменніка.

Ленін пісаў: «Памёр Леў Талстой. Яго сусветнае значэнне, як мастака, яго сусветная славутасць, як мысліцеля і прапаведніка, і тое і другое адлюстроўваюць, па-свойму, сусветнае значэнне рускай рэволюцыі» (т. XIV, стар. 400).

Хвалююча ўспрымаюцца словы Горкага:

«Памёр Леў Талстой.

Атрымана тэлеграма, і ў ёй звычайнейшымі словамі сказана — памёр.

Гэта ўдарыла ў сэрца, зарыдаў я ад крыўды і суму, і вось цяпер, у поўсвядомым якімсьці стане, прадстаўляю яго сабе, як ведаў, бачыў,—мучыцельна хочацца гаварыць аб ім...»

Цярзаемы смуткам ад сазнання мерзасці акружаўшага яго асяроддзя, 82-гадовы пісьменнік рашыў, нарэшце, парваць назаўсёды са сваім звычайным жыццёвым укладам. Напярэдадні ўходу з Яснай Паляны Талстой пісаў:

«Учора праехаў міма б'ючых камень—нібы мяне скрозь строй прагналі. Так, цяжка, мучыцельна нястача, і зайздрасць і злосць на багатых, але не ведаю, ці не больш пакутлівы сорам майго жыцця».

У сваім пісьме да Чэрткова Леў Нікалаевіч скардзіцца: «Няўжо так і прыдзецца памерці, не пражыўшы хоць адзін год па-за сценамі таго вар'яцкага безнраўственага дома, у якім я цяпер прымушан пакутваць кожную гадзіну, не пражыць хоць аднаго года па-чалавечаму разумна...»

І вось рашэнне прынята. Разам са сваім верным, адданым прыяцелем урачом Макавіцкім Талстой тайком пакідае Ясную Паляну. Усхваляванай рукой піша ён жонцы: «...зразумей і павер, што я не мог паступіць інакш. Становішча маё ў доме стала нязносным. Апрача ўсяго іншага, я не магу больш жыць у тых умовах роскашы, у якіх жыў».

А праз два дні становіцца вядома: Талстой цяжка захварэў у дарозе. Яго знялі з поезда на маленькай,



Леў Нікалаевіч ТАЛСТОЙ

захалуснай станцыі Астапава Разана-Уральскай чыгункі і памясцілі ў кватэры начальніка станцыі Озоліна. Жыццё вялікага пісьменніка ў небяспецы.

Першымі заварушыліся ахранка, паліцыя, вышэйшыя саноўнікі. Для іх Талстой—не вялікі мастак, не пакутлівы сын рускага народа. Для царскіх чыноўнікаў і ахраннікаў Талстой перш за ўсё—крамольны граф, небяспечны і непрымірымы вораг і выкрывальнік царскай хлусні і насілля. Паміраючы Талстой не менш, а, быць можа, і больш небяспечны, чым жывы...

Тэрмінова прымаюцца «меры». Ва ўсе канцы ляцяць шыфраваныя тэлеграмы. На станцыю Астапава імкліва імчацца жандарскія ротмістры, губернатары, віцэ-дырэктар дэпартамента паліцыі. Тэлеграф прымае і перадае адзін за другім наступныя шыфраваныя загады: «Камандыраваць у Астапава пяць жандараў», «Унтэр-афіцэру Грыцыніну адправіцца ў Астапава. Узяць вінтоўкі з патронамі», «Унтэр-афіцэрам Серогіну і Дыкіну прыбыць у Астапава са зброяй і патронамі». Разанскі губернатар загадвае: «Прыміце меры не дапускаць навакольнага насельніцтва ў Астапава, дзе ляжыць хворы Талстой. Пасылайце раз'езды стражнікаў па дарогах вяртаць ідучых у Астапава. У выпадку яго смерці будзьце гатовы паслаць туды усю варту». З Тамбова ляціць запытанне—ці не патрэбны для падтрымання парадку гарадавыя і стражнікі. З Ельца прыбывае начальнік жандарскага аддзялення. Здавалася, уся чыноўная Расія гатова апчаціпіцца супроць таго, хто на глухой станцыі Астапава павольна расстаецца з жыццём.

Успалашылася і царкоўная кліка. «Адлучаны ад праваслаўнай царквы» граф Талстой, якому, згодна акта адлучэння, было адмоўлена ў «царкоўным пакаянні», зрабіўся раптам для царскіх мракабесаў аб'ектам самых заўзятых «духоўных клопатаў». Чорнасоценныя «свяцейшаствы» у гэты момант забыліся, як Талстой рэагіраваў на сваё адлучэнне. Ён пісаў тады: «Я пераканаўся, што вучэнне царквы ёсць тэарэтычна няверная і шкодная хлусня, практычна-ж збор самых грубых забабонаў і калдаўства... Я сапраўды адрокся ад царквы, перастаў выконваць яе абрады і напісаў у завяшчанні сваім блізкім, каб яны, калі я буду паміраць, не дапускалі да мяне царкоўных служыцеляў». А цяпер мітрапаліт Антоній з Пецербурга тэлеграфна моліць паміраючага Талстога «паслухацца божага гласу». «Свяцейшаства» так і піша ў сваім пасланні: «З самага першага моманту вашага разрыву з царквой я бесперапынна маліўся і малюся, каб гасподзь вярнуў вас да царквы. Быць можа ён хутка пакліча вас на суд свой, і я вас цяпер умаляю, прымірыцеся з царквой і праваслаўным рускім народам».

На станцыю Астапава прыязджаюць «з дарамі» ігумен Оптынскай пустыні Варсанофій і ерадыякан Панцелеймон. Духоўныя коміваяжоры мітусяцца, бегаюць ад вакзальнага буфета на платформу, адтуль да станцыйнага доміка і назад,назойліва прыстаюць да ўсіх родных Талстога, да ўсіх прыезджых. Усялякімі хітрыкамі карыстаюцца папы, каб выканаць даручэнне сінода—«вярнуць Талстога ў лона праваслаўнай царквы». Хтосьці з «цэнтра» патрабуе вагон для прыезду ў Астапава тамбоўскага епіскапа Кірыла.

Ноччу Варсанофій тайком прабіраецца «з дарамі» да доміка, дзе ляжыць паміраючы. Манаху не ўдаецца пранікнуць да хворага. Ён сканфужана вяртаецца на вакзал, дзе жандарская паліцыя ўстроіла яму прытулак.

У гэтыя дні Владзімір Ільіч Ленін піша:

«...свяцейшыя айцы толькі што прарабілі асабліва гнусную мерзасць, падсылаючы папоў да паміраючага, каб надуць народ і сказаць, што Талстой «раскаяўся» (Ленін, т. XIV, стар. 402).

Уся краіна з трывогай сочыць за тым, што адбываецца на станцыі Астапава.

Кожныя 15—20 мінут ляцяць тэлеграмы ў пецербургскія, маскоўскія і правінцыяльныя газеты. На мясцах выпускаюцца экстраныя бюлетэні аб стане здароўя пісьменніка. З усіх канцоў краіны, з самых глухіх месц прыбываюць чулівыя тэлеграмы з парадамі, як лячыць пісьменніка.

Ля пасцелі хворага бяззменна дзяжураць самыя блізкія і адданыя прыяцелі Талстога.

Наступіла ноч 20 (7) лістапада 1910 года. У 1 гадзіну 10 мінут карэспандэнты тэлеграфіруюць: «Прыпадак сардэчнай слабасці, дрэнна». Праз 17 мінут карэспандэнт «Русских Ведомостей» тэрмінова папярэджвае па тэлеграфу: «Будзьце на-пагатове». Сям'я, якая начуе ў вагоне, выклікана к доміку. Развязка блізка. Усе стаяць на двары. Трывожна ўглядаюцца ў акно, за якім ціха ўгасае вялікае, прыгожае жыццё. Халодны туман акутаў Астапава. На платформе бродзяць цені. Аклікаюць адзін аднаго шэптам. Ходзяць нервовымі крокамі ўзад і ўперад.

У 6 гадзін 5 мінут раніцы Талстой памёр...

Клопатаў у жандараў прыбавілася процьма. Ротмістр Савіцкі заразжа тэлеграфіруе: «Талстой памёр. Узмацніце лінію». У дапамогу Савіцкаму спешна пасылаецца яшчэ 15 унтэр-афіцэраў. Жандарскі афіцэр патрабуе па тэлеграфу «загатовіць вопытных цэнзараў для прагляду надгробных прамоў». Разанскі губернатар паведамляе міністру ўнутраных спраў, што будзе асабіста аглядаць усе вянкі на труну Талстога і «адбіраць ленты з непадыходзячымі надпісамі».

Мітусіцца на вакзале і манах Варсанофій. Яшчэ не ўсё для яго страчана. Неабходна толькі, каб хтонебудзь з сям'і засведчыў, што пакойны выражаў перад смерцю жаданне прымірыцца з царквой. Варсанофій прыстае да ўсіх з гэтым пытаннем. Прагна заглядвае ў вочы субяседнікаў. Дарэмна. Ніхто не знаходзіць магчымым засведчыць. У Астапава прыбывае тульскі епіскап Парфеній. Даведаўшыся аб смерці Талстога, епіскап, не выходзячы з вагона, уязджае. «Божая місія» не выканана. Талстой памёр без царкоўнага пакаяння.

...Талстой пахаван у Яснай Паляне, у лясочку «Стары заказ», на краю абрыва. На магіле няма ніякіх помнікаў. Свежы, нібы толькі ўчора насыпаны ўзгорачак. Чыйсьці клапатлівай рукой пасаджаны незабудкі. За магілай на працягу многіх год асабіста сочыць Сергей Іванавіч Шчэголеў. Вакол усё ціха, толькі па-асенняму шумяць дрэвы. Высока ў неба ўходзіць верны вартавы магілы — задумлівы двухсотгадовы дуб...

І. Родзін.

Ясная Паляна,
1940 г.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

У Беластоцкім гаркоме КП(б)Б

Днямі адбылося чарговае пасяджэнне бюро Беластоцкага гаркома КП(б)Б, на якім былі разгледжаны рашэнні некаторых пярвічных партарганізацый аб прыёме ў партыю.

Сярод прынятых у кандыдаты партыі—тэхнік-канструктар механічнага завода № 35 Р. М. Хаўкіна. Зараз яна з'яўляецца старшынёй выбарчай акругі № 3 па выбарах у гарадскі Совет. Адначасова тав. Хаўкіна з'яўляецца сакратаром комсамольскай арганізацыі і кіруе гуртком несаюзнай моладзі па вывучэнню статута ВЛКСМ. Яна многа працуе над сабой, вывучае «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

Прынятыя ў кандыдаты партыі тт. П. Е. Макеенка—майстар паравознага дэпо і тав. Х. А. Рузіна, — начальнік паравой гаспадаркі фанернага завода актыўна працуюць агітатарамі на ўчастках.

На пасяджэнні бюро заслухан даклад загадчыка аддзелам агітацыі і прапаганды гаркома КП(б)Б тав. Кіркаешта і садаклады: сакратара пярвічнай партарганізацыі 6-га тэкстыльнага камбіната тав. Рубінштэйн, сакратара партарганізацыі 1-га камбіната тав. Новікава і сакратара партарганізацыі плюшавай фабрыкі тав. Ермалаевай аб становішчы масава-палітычнай работы на ўчастках і прадпрыемствах у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Лепш усяго пастаўлена работа па падрыхтоўцы да выбараў на 6-ым тэкстыльным камбінаце. Агітатары гэтага камбіната правялі ўжо 55 гутарак з выбаршчыкамі, у тым ліку 21 гутарку непасрэдна на выбарчым участку. Нядрэнна пастаўлена агітацыйная работа ў Дзяржбанку.

Але-ж у многіх арганізацыях масава-палітычная работа яшчэ як належыць не разгорнута. Асабліва дрэнна яна пастаўлена на 1-ым тэкстыльным камбінаце. З 62 вылучаных агітатараў да работы прыступілі толькі 6 чалавек. У аблвыканкоме агітатары не ведаюць, на якім участку ім трэба праводзіць работу. Таксама слаба разгорнута агітацыйная работа на плюшавай фабрыцы.

Бюро гаркома КП(б)Б указала тт. Новікаву—сакратару партарганізацыі 1-га камбіната, Сіледцову—сакратару партарганізацыі аблвыканкома і Ермалаевай—сакратару партарганізацыі плюшавай фабрыкі на недапушчальнасць такога становішча і прапанавала неадкладна прыступіць да практычнай работы на ўчастках.

Бюро гаркома КП(б)Б прапанавала ўсім сакратарам пярвічных партарганізацый закончыць афармленне ўчасткаў на працягу 2-х дзён і хутчэй ператварыць участкі ў сапраўдныя цэнтры масава-палітычнай работы, наладзіць выпуск насценгазет, галоўнай задачай якіх павінна з'явіцца агітацыя за кандыдатаў у дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў.

Дапамога партыйнага кабінета самастойна вывучаючым „Кароткі курс гісторыі ВКП(б)"

З дня выхаду ў свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» прайшло два годы.

Цэнтральны камітэт нашай партыі ў сваёй пастанове аб пастаноўцы прапаганды марксізма-ленінізма ў Беларускай ССР, Орлоўскай і Курскай абласцях указаў на неабходнасць шырока выкарыстаць такія формы работы, як таварыскія субяседванні, кансультацыі і іншыя формы ў дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю нашай партыі.

У адпаведнасці з гэтым Беластоцкі гарадскі партыйны кабінет будуе сваю работу. За 10 месяцаў сваёй работы партыйны кабінет аказаў вялікую дапамогу самастойна вывучаючым гісторыю і тэорыю бальшэвізма. За гэты час было праведзена ў парткабінеце і ў буйнейшых партыйных арганізацыях 178 кансультацый па гісторыі ВКП(б) і асобных творах класікаў марксізма-ленінізма, якія наведала 1.969 чалавек. Акрамя таго праведзена вялікая колькасць індывідуальных кансультацый.

У Беластоцкай гарадской партыйнай арганізацыі ёсць нямала прыкладаў, калі кансультацыі, у выніку добрага кіраўніцтва сакратароў партарганізацый, праходзілі з вялікай цікавасцю, напрыклад, у партарганізацыях: мясакамбіната, 2-га тэкстыльнага камбіната, экспартлесу, 1-га тэкстыльнага камбіната і т. д. Але ёсць і такія партарганізацыі, дзе сакратары не ўлічваюць індывідуальных запатрабаванняў комуністаў, даюць заяўкі на кансультацыі, а комуністы аб гэтым нічога не ведаюць. Такі недапушчальны факт быў у партарганізацыі горрайсувязі (сакратар т. Смірнова), дзе на групавую кансультацыю з'явілася 8 комуністаў, з якіх ніхто не ведаў, на якую тэму будзе праводзіцца кансультацыя.

У дапамогу вывучаючым «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» пры парткабінеце арганізавана выстаўка наглядных матэрыялаў на ўсіх 12 раздзелах «Кароткага курса», дадзены таксама метадычныя ўказанні аб самастойнай рабоце над кнігай. Акрамя таго, арганізавана выстаўка ў дапамогу агітатарам, якія працуюць на ўчастках па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, аб дасягненнях совецкай улады за 23 годы і аб тых велізарных змяненнях, якія адбыліся за год совецкай улады ў заходніх абласцях БССР, у прыватнасці ў Беластоку.

Шырока выкарыстоўваецца нашымі партыйнымі і непартыйнымі большэвікамі бібліятэка парткабінета, у якой налічваецца 23 тысячы кніг палітычнай і мастацкай літаратуры.

А. Перапецкі.

Семінар сакратароў гаркомаў і райкомаў комсамола

12 і 13 лістапада ў Беластоцкім абкоме комсамола адбыўся семінар сакратароў райкомаў і гаркомаў комсамола. Прысутнічала 23 чалавекі. Сакратары праслухалі рад лекцый і дакладаў аб арганізацыі кіруючай работы ў комсамоле.

Сакратар абкома комсамола тав. Маўрын прачытаў лекцыю, у якой падрабязна спыніўся на задачах гаркомаў і райкомаў па наладжванню комсамольскай гаспадаркі, па арганізацыі прыёму ў рады ленінскага комсамола моладзі, па планіраванню работы гарадскіх і раённых камітэтаў, па выхаванню кадраў, праверцы выканання рашэнняў і т. д.

Лекцыю аб юнацкім комуністычным руху ў СССР прачытала інструктар абкома комсамола тав. Філатава.

У заключэнне семінара сакратары райкомаў і гаркомаў комсамола абмяняліся вопытам комсамольскай работы па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. З прамовамі выступілі: сакратар Гродненскага гаркома комсамола тав. Кузьмін, сакратар Парэцкага райкома тав. Бугаеў, сакратар Цэханавецкага райкома тав. Папоў і іншыя.



У беластоцкім Доме партасветы адкрыта выстаўка, прысвечаная 2-ой гадавіне з часу выпуску «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Выстаўку наведвае многа людзей.

На здымку: наведвальнік І. Л. Кан знаёміцца з выстаўленай літаратурай.

Фота А. Сапіра.



У Беластоку адкрылася фабрыка скуранай галантарэі.

На здымку: мадэльшчык Я. М. Левін за работай над новай мадэллю дамскай сумкі; у цэнтры работніцы М. Н. Кліман, Я. Ч. Качэкоўская і Б. М. Шамрэта за работай; кантралёр Я. І. Івашчук прымае гатовую прадукцыю.

Фота Е. Халдэя.

У ДАПАМОГУ АГІТАТАРУ

Беластоцкая область за год совецкай улады

(Лічбы і факты)

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

Прамысловасць на тэрыторыі Беластоцкай вобласці, па афіцыяльнай польскай статыстыцы, складалася з 445 розных прадпрыемстваў, у якіх працавала 9.654 рабочых.

Тэкстыльная вытворчасць з'яўляецца асноўнай галіной прамысловасці вобласці. Пры польскім панаванні тэкстыльная вытворчасць была ў большасці сваёй поўсаматужнай. Абсталяванне, якое прывозілася з-за граніцы, было ўстарэлае і зношанае. І гэта абсталяванне скарыстоўвалася на 30—40 процантаў, бо прадпрыемствы працавалі ўсяго па 6—7 месяцаў у год з няпоўнай нагрузкай.

Прамысловасць працавала на прывознай сыравіне і паліве. Якасць гэтай сыравіны была самай нізкай. Гэта было старое рыззё, што прывозілася з Германіі, Швейцарыі і Прыбалтыкі. Да гэтага дадавалася «баваўна» — ачосы з лодзінскіх тэкстыльных фабрык. З такой змескі пралі і ткалі грубыя тканіны, якія разлязаліся. Гэтыя вырабы не знаходзілі збыту нават у Польшчы, іх вывозілі ў Індыю і Кітай. Але часта і адтуль прыходзіла назад «славутае» беластоцкае сукно.

Пасля нацыяналізацыі прадпрыемстваў перад совецкай уладай першай задачай паўстала забеспячэнне вытворчасці добраякаснай сыравінай. Затым трэба было рэканструіраваць і сканцэнтрыраваць вытворчасць. У Беластоку і прыгарадах — Супраслі, Міхалове, Гарадку і Васількове — з 133 дробных фабрычак і поўсаматужных майстэрань, на якіх працавала 4.792 рабочых, створана 29 буйных тэкстыльных камбінатаў і фабрык, на якіх занята зараз 10.954 рабочых.

Канцэнтрацыя прамысловасці незмерна павысіла прадукцыйнасць працы і вытворчую магутнасць фабрык. Першы беластоцкі тэкстыльны камбінат створан з аб'еднання 11 фабрык. Зараз на камбінаце працуе 1.206 чалавек.

Былі ўзбуйнены і сканцэнтрыраваны ўсе тэкстыльныя прадпрыемствы совецкага Беластока. Краіна забяспечвае іх высокаякаснай воўнай і баваўнай, і прадпрыемствы выпускаюць моцныя добротныя тканіны.

За 10 месяцаў 1940 года тэкстыльны Беласток даў совецкай краіне 10.140.000 метраў суконных тканін і 220.479 метраў плюшу.

Скурана-абутковая прамысловасць займае ў вобласці другое месца пасля тэкстыльнай. З дробных брудных прыватных гарбарань створана 11 скураапрацоўчых заводаў. Буйнейшы ў вобласці скурзавод у Крынках, на якім занята 407 рабочых, арганізаван з аб'еднання 7 гарбарань, дзе працавала па 4—11 рабочых. Зараз два скурзаводы ў Беластоку з 597 рабочымі, два ў Гродне (300 рабочых), завод у Заблудаве (222 рабочых), Скідэлі (199 рабочых), Ясінаўцы (155 рабочых), Саколцы (186 рабочых), Свіслачы (158 рабочых) і Аўгустове (53 рабочых).

Значна ўзбуйнены і расшыраны абутковыя фабрыкі, з іх дзве ў Беластоку (357 рабочых) і адна ў Гродне (192 рабочых замест 95 раней). Абутковыя фабрыкі выпусцілі з пачатку года 72.800 пар гатовага скуранога абутку.

У вобласці ёсць вялікая колькасць поўсаматужных шавецкіх майстэрань, якія вырабілі 150.600 пар гатовага абутку.

Прамысловасць будаўнічых матэрыялаў у нашай вобласці набывае вельмі важнае значэнне і займае значнае месца. На многіх цагельна-кафельных заводах механізіравана і аблегчана праца. На цагельных заводах у Гродне, Ломжы, Ваўкавыску, Казаўшчызне (Беластоцкі раён) і Катлянах (Заблудаўскі раён) занята ўсяго 832 рабочых. Цагельныя заводы далі краіне за 9 месяцаў г. г. 22 мільёны 64 тысячы штук цэглы. Чарапічныя заводы далі за гэты час 395 тысяч штук чарапіцы.

Адзіны ў вобласці цэментны завод «Рось» (Ваўкавыскі раён) паспяхова выконвае дзяржаўны гадавы план. За 10 месяцаў выраблена 83.191 тона цэменту — 79,2 процанта гадавога плана і 94.075 тон клінкеру — 89,5 проц. Кастрычніцкі план заводам выканан на 100,86 проц. па цэменту і на 127,4 проц. па клінкеру.

Лясная прамысловасць састаіць з 6 лесапільных заводаў — у Чорнай Весі (615 рабочых), Аўгустове (398 рабочых), Азёрах (316 рабочых), Ваўлах (277 рабочых), Гродне (199 рабочых) і Жэдні (177 рабочых), — якія за 9 месяцаў з пачатку года далі краіне 132.900 кубічных метраў піламатэрыялаў. Фанерныя заводы ў Дайлідах (на 717 рабочых) і Гродне (655 рабочых) далі 21 тысячу кубаметраў фанеры.

Совецкая ўлада ўзяла пад беражлівую ахову і эканомнае выкарыстанне лясных масіваў — вялікага народнага багацця.

Харчовая прамысловасць, якая раней складалася з брудных, антысанітарных дробных пякарань, бойняў, каўбасных і іншых майстэрань з саматужнай вытворчасцю, значна ўзбуйнена і ўзята пад строгі санітарны нагляд. Пабудован беластоцкі хлебакамбінат, на якім занята зараз 437 рабочых. Створаны хлебакамбінаты ў Гродне, Ломжы, Ваўкавыску, Бельску і Аўгустове. Кандзіцерская фабрыка ў Беластоку выпусціла звыш 760 тон розных кандзіцерскіх вырабаў. Павялічылі вытворчасць піўныя заводы, якія далі за 9 месяцаў 5.848.000 літраў піва. Маслабойныя заводы Галоўмаслапрома выпрацавалі 419 тон жывёльнага масла і 1.805,5 тоны раслiннага. Мукамольныя дзяржаўныя прадпрыемствы далі да кастрычніка месяца 19.874 тоны рознай мукі. Па сістэме рыбтрэста ў вадаёмах вобласці вылаўлена 3.307 цэнтнераў рыбы. Мясная прамысловасць дала 5.754 тоны мяса.

У Беластоку адноўлена і зусім занава рэканструіравана, абсталявана новымі совецкімі машынамі добрая табачная фабрыка. Значна палепшана вытворчасць на гродненскай табачнай фабрыцы.

Харчовая прамысловасць у вобласці мае зараз вялікія магчымасці росту і расшырэння.

З іншых відаў прамысловасці трэба адзначыць шклозаводы — у Беластоку (305 рабочых) і Гродне (253 рабочых), якія значна павялічылі вытворчасць. Тут яшчэ неабходна вялікая рэканструкцыя і абсталяванне новай совецкай тэхнікай, асабліва на працэсе выдування шкла.

Швейная прамысловасць цалкам арганізавана занава. У вобласці створаны 3 буйных швейных фабрыкі —атэлье мод у Беластоку (з 289 рабочымі), Гродне (160 рабочых) і Ваўкавыску (193 рабочых). У гарадах і мястэчках вобласці арганізавана вялікая колькасць швейных арцелей.

Непазнавальным стаў беластоцкі чыгуналіцейны завод, які пабудаван яшчэ ў 1898 г., але пры польскім панаванні быў зусім запушчан.

Вялікую ролю ў разгортванні мясцовай прамысловасці адыгрываюць промкамбінаты. Самы буйны з іх—беластоцкі горпромкамбінат аб'ядноўвае меблевую фабрыку (118 рабочых), шавецкія майстэрні, лесазавод, фабрыку металавырабаў і многія іншыя вытворчасці. Райпромкамбінаты створаны ва ўсіх раёнах вобласці.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Самай буйнай перамогай у сельскай гаспадарцы нашай вобласці з'яўляецца надзяленне бедных і бяднейшых сялян зямлёй, якую совецкая ўлада адабрала ў памешчыкаў і асаднікаў—ворагаў і эксплаататараў працоўнага сялянства. Калгасы атрымалі ў вечнае карыстанне 28.953 гектары, сяляне-серадн які — 5.613 га, беднякі — 33.753 га і батракі — 18.101 га. Беднякам і батракам выдана бясплатна 4.021 конь, 5.781 карова і 4.013 галоў дробнай жывёлы. Вясенняя сяўба была праведзена паспяхова і з перавыкананнем плана пасеву: па зернавых культурах на 10,3 проц., па бульбе на 1,9 проц. і па ільну на 3,4 проц.

Свабоднае сялянства бачыць лепшы шлях свайго жыцця ў калектыўнай гаспадарцы, у супольнай дружнай працы. На працягу 1940 года ў вобласці добраахвотна арганізавалася 164 калгасы. Пасеўныя плошчы складаюць зараз 31.258 гектараў. У гэтым годзе калгасы знялі ўраджай каласавых з 23.684 га. Па азімых на 1941 год калгасамі пасеяна 14.377 га — 103 проц. плана.

У вобласці створана 9 соўгасаў, якія займаюць 5.034 гектары пахаці. Соўгасы маюць 25 трактараў.

Ва ўсіх раёнах вобласці арганізавана 24 машынна-трактарных станцыі, якія маюць 214 трактараў.

НАРОДНАЯ АСВЕТА

Совецкая дзяржава штодзённа клапоціцца аб развіцці асветы і культуры працоўных. На 1940 год па Беластоцкай вобласці асігнавана 63.688.200 рублёў на справу народнай асветы.

Пачотны атрад совецкіх настаўнікаў налічвае 5.960 чалавек.

На абучэнне падросткаў, ліквідацыю непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослага насельніцтва ў вобласці на 1940 год адпушчана 974.100 рублёў. Для гэтай мэты створана 81 школа на 7.250 чалавек.

У гэтым годзе арганізавана 56 дзіцячых садоў на 3.400 дзяцей. На ўтрыманне кожнага дзіцяці ў дзіцячым садзе затрачваецца ў год 1.340 рублёў, з якіх 70 проц. дае дзяржава і 30 проц. — бацькі.

Для барацьбы з беспрытульнасцю ў вобласці існуе 18 дзіцячых дамоў, у якіх выхоўваецца 1.295 беспрытульных дзяцей. На кожнага выхаванца дзетдома дзяржава траціць 3.060 рублёў у год.

Вялікую ролю ў культурным росце працоўных займаюць дамы соцыялістычнай культуры, якіх у раённых цэнтрах адкрыта 24. У вёсках адкрыта 226 хат-чытальнь.

У вобласці створана 1 абласная бібліятэка з кніжным фондам каля 50 тысяч тамоў, 23 раённых, 9 гарадскіх, 74 сельскіх і 3 цэнтральных дзіцячых бібліятэкі.

АХОВА ЗДАРОЎЯ

У былой Польшчы аховай народнага здароўя дзяржава мала цікавілася. Сярод насельніцтва не выводзіліся бытавыя і эпідэмічныя хваробы. Лячэнне было прыватнае і каштавала вельмі дорага, таму працоўныя не маглі звяртацца за медыцынскай дапамогай.

Совецкая ўлада прадастаўляе ўсім працоўным бясплатную медыцынскую дапамогу.

У гарадах і гарадскіх пасёлках ёсць 46 амбулаторый і паліклінік, дзе працуе 377 урачоў. Ёсць 2 дзіцячыя бальніцы і 5 самастойных радзільных дамоў. Ва ўсіх гарадах і раённых цэнтрах існуюць дзіцяча-жаночыя кансультацыі.

З мэтай абслугоўвання медыцынскай дапамогай самых аддалёных населішчаў там арганізавана 22 фельчарскіх пункты, 50 фельчарска-акушэрскіх пунктаў і 18 трахоматозных сястрынскіх пунктаў.

У вобласці арганізавана 7 туберкулёзных дыспансераў і пунктаў і 1 туберкулёзная бальніца. У гарадах адкрыта 9 скурна-венерычных дыспансераў і пунктаў.

На прадпрыемствах арганізаваны 20 урачэбных здраўпунктаў і 20 фельчарска-сястрынскіх пунктаў.

У кожным горадзе і раённым цэнтры круглыя суткі працуе хуткая медыцынская дапамога. У Беластоку арганізавана хуткая дапамога санітарнай авіяцыі, якая абслугоўвае ўсю вобласць.

Для санітарна-прафілактычнай работы ў вобласці арганізавана 5 міжраённых санітарных станцый і 8 раённых. 18 дзяржсанінспектараў і 13 іх памочнікаў сочаць за санітарным становішчам населеных месц і вытворчых прадпрыемстваў.

У гарадах і гарадскіх пасёлках разгортваецца 1.035 ясельных ложкаў і 6 малочных кухань. Адкрыты 3 дамы дзіцяці. У школах і дзетдамах працуе 33 урачы і 66 медсясцёр.

У Друскеніках і Пышках арганізавана 2 сезонных дзіцячых санаторыі.

У сезон 1940 года на курорце «Друскенікі» адпачывала і лячылася каля 5 тысяч працоўных.

Усяго на ахову здароўя па Беластоцкай вобласці дзяржавай асігнавана на 1940 год 28 мільёнаў рублёў — 20 процантаў усяго бюджэта вобласці.

ВОЎЧЫ ЗАКОН КАПІТАЛІЗМА

(З дакументаў мінулага)

Засядаў магістрат горада Гродна. «Бацькі горада»—купцы, фабрыканты, банкіры — рашалі пытанне аб устанаўленні пенсіі.

Слухаецца заява ветурача Леановіча. Леановіч аказаўся ў жудасным становішчы. Працуючы ветурачом, ён праваруваўся на гродненскай бойні. Зладзеі і машэннікі вялікага маштаба не хацелі мець справы з маленькім зладзеем, як Леановіч, — і яго выгналі з бойні. Зладзеяў звычайна судзяць, але Леановіча судзіць баяліся: ён-бы раскрыў непрыемныя справы. Вось гэты зладзей рашаецца прасіць пенсію ў размеры 200 злотых у месяц.

Слова па гэтаму пытанню ўзяў сам віцэ-прэзідэнт Савіцкі.

— Панове! — заявіў ён. — Культурны і адукаваны чалавек, як Леановіч, наўрад ці зможа пражыць на 200 злотых. Я прапаную даць яму 400 злотых.

Зладзей Леановіч пайшоў з пасяджэння магістрата вельмі задаволены.

Затым разбіралася заява маці Эмерта Станіслава. Малады рабочы-паляк Эмерт загінуў на рабоце, якую ён выконваў па заданню магістрата. Маці прасіла ўстанавіць ёй пенсію 20 злотых у месяц, каб пракарміць астаўшыхся ў сям'і трох непрацаздольных.

Слова па гэтай заяве ўзяў той-жа віцэ-прэзідэнт Савіцкі.

— Панове! — зноў заявіў ён.— Мы павінны разумна рашыць гэтае пытанне. Я даводжу вас да ведама, што пан Эмерт Станіслаў загінуў з-за сваёй уласнай неасцярожнасці, а таму я прапаную яму ў пенсіі адмовіць.

З поўнымі слёз вачыма маці загінуўшага сына пайшла з магістрата.

Такія былі законы, воўчыя законы капіталізма.

Мель.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ў ноч на 13 лістапада непрыяцель аднавіў свае атакі на Англію. Гэтыя атакі адбываліся ў шырокіх маштабах. Бамбардыроўка Лондана працягвалася з перапынкамі ўсю ноч. Налёты на цэнтральныя графствы і раён ракі Мерсей не былі вельмі цяжкімі. У розных пунктах скінуты бомбы. Матэрыяльны ўрон нязначны, лік афяр невялікі. Скінуты таксама бомбы ў суседніх з Лонданам графствах, у Паўднёва-Усходняй Англіі. Прычынен нязначны ўрон і налічваецца невялікая колькасць афяр. У ноч на 13 лістапада англійскія самалёты падверглі бамбардыроўцы нафтасховішча ў Гельзенкірхене і Кельне. Затым былі скінуты бомбы ў рачным порце Дуісбурга і на чыгуначныя вузлы і заводы ў Рурскай вобласці. Акрамя таго налёт зроблен на непрыяцельскія аэрадромы. Адзін англійскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

13 лістапада на працягу дня германскія самалёты скінулі невялікую колькасць бомб на некаторыя прыбярэжныя гарады графства Кент.

Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне, у якім гаворыцца, што ў ноч на 14 лістапада над Англіяй лятала невялікая колькасць непрыяцельскіх самалётаў. Бомбы скінуты над адным з раёнаў Лондана, а таксама над некаторымі пунктамі Паўднёва-Усходняй Англіі. У Лондане і ў некаторых месцах Усходняй і Паўднёва-Усходняй Англіі былі прычынены пашкоджанні жылым будынкам. У іншых раёнах, якія падвергліся бамбардыроўцы, матэрыяльныя страты невялікія.

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што германскія самалёты бамбардыравалі ўчора Лондан і Паўднёвую Англію. Бамбардыроўцы падвергліся заводы і чыгуначныя збудаванні на ўсім узбярэжжы. Англійскія знішчальнікі прабавалі перашкодзіць бамбардыроўцы і атакаваць германскія знішчальнікі. Пры гэтым быў збіт адзін англійскі знішчальнік. Два іншых самалёты цяжка пашкоджаны. Адзін германскі самалёт не вярнуўся на сваю базу.

Учора ўвечары англійскія самалёты прабавалі зрабіць налёт на Берлін. Аднак з прычыны моцнага зенітнага агню ім не ўдалося прарвацца праз затараджальную зону к гораду.

У мінулую ноч, не гледзячы на неспрыяючае надвор'е, германскія самалёты працягвалі налёты на Лондан. Асабліва сур'ёзныя пашкоджанні прычынены чыгуначным збудаванням у Паўночна-Заходняй частцы горада. Моцныя ўзрывы адбыліся ў Вест-Індскіх доках і іншых частках горада. Узмоцненай бамбардыроўцы падвергліся Ліверпуль і Ковентры, а таксама некаторыя пункты на ўзбярэжжы Ла-Манша. На працягу ўчарашняга дня германскія самалёты бамбардыравалі многія ваенныя аб'екты ў Лондане і Паўднёвай Англіі.

Зводка германскага камандавання

БЕРЛІН, 14 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку камандавання германскай арміі: Адна германская падводная лодка патапіла 5 узброеных гандлёвых параходаў праціўніка агульным танажам у 28.840 тон. Не гледзячы на неспрыяючае надвор'е, буйныя злучэнні германскай авіяцыі працягвалі ў ноч на 13 лістапада налёты на тэрыторыю Англіі. Многалікія пажары і ўзрывы адзначаны на чыгуначных збудаваннях паўночна-заходняй часткі Лондана, у Вест-Індскіх доках і іншых ваенных аб'ектах горада. Паспяховай бамбардыроўцы падвергліся таксама Ліверпуль і Ковентры. Учора германскія бамбардыроўшчыкі атакавалі Лондан і іншыя ваенныя аб'екты ў Паўночнай і Цэнтральнай Англіі і скінулі бомбы, галоўным чынам на аэрадромы і чыгуначныя збудаванні, а таксама на ваенны завод каля Бірмінгама. На моры, каля мыса Кінарда, зроблена два паспяховых налёты на караван непрыяцельскіх суднаў. Патоплена гандлёвае судно ў 6 тысяч тон, другое судно ў 8 тысяч тон. У 350 кілометрах на захад ад Ірландыі германскі бамбардыроўшчык патапіў англійскае грузавое судно танажам у 7 тысяч тон.

Начныя налёты англійскай авіяцыі на тэрыторыю Германіі не далі істотных вынікаў. Пашкоджана некалькі будынкаў. Спроба нападу на Берлін не ўдалася.

Запытанні ў палаце абшчын

ЛОНДАН, 13 лістапада. (ТАСС). Адказваючы на запытанні ў палаце абшчын, ваенны міністр Ідэн запэўніў, што паміж камандаваннем арміі і авіяцыяй дасягнута дэтальнае і ўсёахапляючае ўзгадненне аб цесным супрацоўніцтве. На працягу некалькіх апошніх месяцаў гэтае пытанне абмяркоўвалася міністэрствам авіяцыі і ваенным міністэрствам. У рэзультаце гэтых перагавораў распрацаван план, які далёка пераўзыходзіць усё, што мела месца раней. Гэты план увойдзе ў сілу к 11 снежня. Далей Ідэн указаў, што ён не можа поўнасцю асвятліць характар распрацаванага плана, аднак супрацоўніцтва ўсіх родаў зброі сухаземнай арміі і авіяцыі знаходзіцца зараз на трывалай аснове. Адказваючы на далейшыя запытанні, Ідэн указаў, што на Бліжнім Усходзе гэтае пытанне вырашана здавальняюча.

Ідэн заявіў таксама, што лік ваеннапалонных англічан дасягае 44 тысяч чалавек.

Налёт англійскай авіяцыі на Берлін

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр з Нью-Йорка, англійскія самалёты зрабілі налёт на Берлін у ноч на 14 лістапада, у той час, як Молатаў даваў банкет у чэсць вышэйшых кіраўнікоў Германіі. Госці Молатава асталіся ў савецкім паўнамоцным прадстаўніцтве да адбою паветранай трывогі, данага сёння раніцай.

РОСТ ЦЭН на ХАРЧОВЫЯ ТАВАРЫ У АНГЛІІ

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Група відных англійскіх эканамістаў апублікавала бюлетэнь аб руху цэн на харчовыя тавары ў Англіі. У бюлетэні ўказваецца, што цэны на гэтыя тавары ўзраслі з пачатку вайны на 47 працантаў. У бюлетэні ўказваецца таксама, што цэны на рознага роду матэрыялы павялічыліся за гэты перыяд на 37 працантаў.

―o―

Зводка вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі

АФІНЫ, 14 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі паведамляе, што ўчора грэчаскія самалёты бамбардыравалі аэрадромы Корчы, знішчыўшы на зямлі вялікую колькасць самалётаў праціўніка. Бамбардыроўцы падвергліся таксама скапленні непрыяцельскіх войск.

Авіяцыя праціўніка зрабіла ўнутры краіны налёты на гарады і вёскі, не маючыя ніякага ваеннага значэння. Ёсць некалькі забітых і раненых.

У выніку паспяховага наступлення ў раёне гор Пінд грэчаскімі войскамі заняты новыя вышыні на албанскай тэрыторыі.

Авіяцыя праціўніка бамбардыравала Аргастальён, на востраве Кефалінія, дзе ёсць некатарая колькасць афяр. Налёту падвергліся таксама востраў Лефкас і дзве вёскі ў Пелапанесе. Афяр і разбурэнняў няма.

БАМБАРДЫРОЎКА ТАРАНТА


ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у ноч на 14 лістапада англійскія самалёты атакавалі докі і гавань у Таранта і вярнуліся на сваю базу.

РАСКРЫЦЦЁ НОВАГА ЗАГАВОРУ У ФРАНЦУЗСКАЙ СІРЫІ

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Каірскі карэспандэнт газеты «Ньюс кронікл» паведамляе, што нядаўна, другі раз за апошнія два месяцы, французскія ўлады ў Сірыі раскрылі новы загавор у арміі, арганізаваны прыхільнікамі генерала дэ Голя.

КАРАНТЫН У ЦУРУГЕ СУПРОЦЬ ЧУМЫ

ТОКІО, 14 лістапада. (ТАСС). Газета «Цуруга Дзідзі» паведамляе, што адміністрацыя мытні ў Цуруге (Японія) у сувязі з эпідэміяй чумы, якая ахапіла паўночную частку Манчжурыі, падвяргае строгаму карантыну судны, якія прыбываюць з Карэі і Манчжурыі. Паліцэйскія ўлады распарадзіліся зрабіць прышчэпку ўсёй камандзе парахода «Харбін-мару», які курсіруе на еўрапейска-азіяцкай лініі.



Стаханаўская брыгада гродненскай табачнай фабрыкі, уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, выконвае норму на 160 працантаў.

На здымку (злева направа): Р. М. Александровіч, Р. Я. Ламперт, М. А. Загурская.

Фота А. Сапіра.

Шырыцца соцыялістычнае спаборніцтва

Дадзім звыш плана 120 тысяч метраў тканіны

Тэкстыльная фабрыка № 29 па праву лічыцца адным з перадавых прадпрыемстваў у Беластоку. Гадавы план па метражу калектыў выканаў яшчэ 28 кастрычніка. Датэрмінова выканан гадавы план па пражы.

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, калектыў фабрыкі даў выдатныя паказчыкі ў сваёй рабоце. 80 працантаў з усяго састава рабочых асвоілі норму выпрацоўкі. Выключных паказчыкаў калектыў дасягнуў у кастрычніку. Па пражы план выканан на 118 працантаў, па ткацтву—на 115 працантаў. Першасортнай прадукцыі выпушчана 94 працанты.

Паасобныя стаханаўцы дасягнулі высокапрадукцыйнай работы. Стаханаўцы тт. Кац, Дзіцкі, Худзін выконваюць норму выпрацоўкі звыш чым на 110 працантаў. Стаханаўкі-прадзільшчыцы тт. Салвацкая, Савіцкая, Бібар і іншыя выконваюць норму на 116 працантаў.

Калектыў фабрыкі змагаецца за атрыманне пераходнага чырвонага сцяга наркамата тэкстыльнай прамысловасці БССР. Калектыў абавязаўся да канца года даць краіне звыш плана 120 тысяч метраў тканіны.

Н. Гільман, К. Баракін.

Дапамагаю рабочым стаць стаханаўцамі

У перадкастрычніцкім соцыялістычным спаборніцтве наш калектыў дабіўся значных поспехаў у сваёй рабоце. За першы месяц 4-га квартала вытворчая праграма па заводу выканана на 141 працант.

Я з'яўляюся стаханаўцам-ліцейшчыкам, сістэматычна перавыконваю свой план, даю дзве з паловай і больш нормы. У кастрычніку я выканаў свой план на 260 працантаў і зарабіў за гэты месяц 1.400 рублёў. Такіх паказчыкаў я дабіўся чэснай і адданай працай. Я стараюся, каб ні адна мінута не прапала дарма, каб поўнасцю скарыстаць рабочы дзень.

Стараюся свой вопыт стаханаўскай работы перадаваць маім вучням тт. Ракошыну, Міхаліку і іншым. Актыўна ўдзельнічаю ў грамадскай рабоце, з'яўляюся членам акруговай выбарчай камісіі. Я абавязаўся выконваць план не ніжэй чым на 300 працантаў і дапамагчы тром рабочым стаць стаханаўцамі.

І. Кендэрскі,
стаханавец Ломжынскага завода сельскагаспадарчых машын.

ПЕРАДАВЫ ЦЭХ

У лютым 1940 года кіраўніцтва апаратна-прадзільнага цэха 4-га тэкстыльнага камбіната даверылі сакратчыцы тав. Антоненка. З вялікай настойлівасцю ўзялася яна за работу. У мінулым адстаючы цэх пад кіраўніцтвам начальніка цэха Антоненка вышаў у перадавыя. Поўгадавая вытворчая праграма выканана на 119,6 працанта.

У кастрычніку план па выпуску пражы выканан на 110,9 працанта.

Цэх гардзіцца сваімі лепшымі стаханаўцамі - вінтаўшчыцамі тт. Пылкоўскай, Здрадоўскай, прысучальшчыцамі Жукоўскай, Панасевіч і іншымі, якія значна перакрываюць вытворчую праграму.

Добра наладжаная работа ў цэху з'яўляецца ў вялікай ступені заслугай начальніка гэтага цэха тав. Антоненка. Ацаніўшы яе заслугі, калектыў 4-га камбіната вылучыў кандыдатуру тав. Антоненка ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Савета.

Е. Раткевіч.

СТАХАНАЎСКАЯ ВАХТА

Рабочыя фарбавальнага цэха 2-га тэкстыльнага камбіната 31 кастрычніка і 1 лістапада сталі на стаханаўскую вахту, прысвечаную выбарам у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных. Вынікі вахты выдатныя. Лепшыя рабочыя значна перакрылі свае нормы выпрацоўкі. Асабліва адзначыліся рабочыя-сушыльшчыкі Бокштэйн, Бранецкі, якія выканалі план на 130 працантаў. Па фарбаванню баваўны сваёй высокапрадукцыйнай работай вызначыліся тт. Кусавіцкі, Генер, Масквічоў, Садчук, выканаўшыя план на 170 працантаў.

НАРАДА ТАРФЯНІКАЎ

Днямі ў Беластоку адбылася абласная нарада тарфянікаў мясцовай паліўнай прамысловасці, на якой прысутнічала каля 100 чалавек дырэктараў торфзаводаў, тэхнарукаў і стаханаўцаў.

З дакладам аб выніках работы за сезон 1940 года і падрыхтоўцы да новага сезона выступіў начальнік абласнога аддзела мясцовай паліўнай прамысловасці тав. Смоляк.

За мінулы сезон заводы выканалі план здабычы торфу толькі на 80 працантаў, даўшы 30 тысяч тон торфу. Рад заводаў перавыканаў план; сярод іх — завод «Пнева» (дырэктар тав. Цэбуляк) Ломжынскага раёна, які даў 135 працантаў плана; «Кнарозы» (дырэктар тав. Левін) Бельскага раёна, — 110 працантаў і іншыя.

За гэты час створаны кадры тарфянікаў, якіх раней у вобласці зусім не было. Многія рабочыя паказалі сябе добрымі стаханаўцамі. На 380 працантаў выконваў норму выпрацоўкі рабочы тав. Рыбалка, на 320 — тав. Янушка, на 400 працантаў — тав. Клебан. Выдатных вынікаў дабіліся і іншыя рабочыя.

У сезоне 1940 года торфзаводы мясцовай паліўнай прамысловасці павінны даць 58 тысяч тон торфу.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Выступіла больш 30 чалавек.

Нарада прыняла рад важных рашэнняў па падрыхтоўцы да новага торфасезону.

―o―

Рэдкая знаходка

БАРАНАВІЧЫ. Днямі дырэктар Баранавіцкага абласнога музея выяўленчага мастацтва Леанард Францавіч Турскі ў сваіх архівах выпадкова знайшоў маленькую кніжачку—поўнае выданне твораў вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

Кніжачка велічынёю ў паштовую марку. Яе даўжыня 3,5 сантыметра, шырыня 2,2 сантыметра і таўшчыня 1 см. Яна была выпушчана на польскай мове яшчэ ў 1898 годзе ў Варшаве нейкім выдаўцом М. Шольцам і змяшчае ў сабе 692 старонкі. Няўзброеным вокам тэкст чытаць нельга, і для гэтай мэты ў сярэдзіну бронзавага футлярчыка для хавання кніжачкі ўвінчана павелічальнае шкло.

У гэтай малюсенькай кніжачцы змешчана 12 кніг вялікай эпапеі Адама Міцкевіча—«Пан Тадэуш», паэмы «Фарыс» і «Шахматы», гістарычнае апавяданне «Канрад Валенрод», вялікія драмы «Дзяды», «Рамэо і Юлія», усе балады і рамансы, у тым ліку «Пані Твардоўская», «Тры Будрысы», якія ў свой час пераклаў А. С. Пушкін, санеты эратычныя, санеты крымскія, элегіі. Апрача таго змешчана многа альбомных вершаў, казак, дробных апавяданняў і зробленых аўтарам перакладаў.

Па поваду гэтай рэдкай знаходкі Леанард Францавіч Турскі паведаміў, што падобную кніжачку з поўным выданнем твораў вялікага паэта Адама Міцкевіча ён атрымаў у 1898 годзе на юбілейным вечары як падарунак на памяць ад свайго прыяцеля—сына прафесара львоўскага універсітэта Леанарда.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 27

БЕЛАСТОЦКАГА ГАРАДСКОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

ад 3 лістапада 1940 г.

АБ ПАРАДКУ ВЫКЛІКУ І РАБОЦЕ ХУТКАЙ МЕДЫЦЫНСКАЙ ДАПАМОГІ.

1. Хуткая медыцынская дапамога выязджае:

а) пры няшчасных здарэннях, патрабуючых аказання неадкладнай медыцынскай дапамогі. Да ліку такіх здарэнняў адносяцца аўтамабільныя, вулічныя катастрофы, цяжкія раненні і апёкі, падзенне з вышыні, паражэнне электрычнасцю або маланкай, утапленне, удушэнне, цеплавы або сонечны ўдар, атручэнне хімічнымі ядамі, роды на вуліцах;

б) пры раптоўных захворваннях, пагражаючых жыццю, калі такія мелі месца на вытворчасці, ва ўстановах, на вуліцы або іншых грамадскіх месцах і калі неабходная медыцынская дапамога ў такіх выпадках не можа быць аказана бліжэйшай медыцынскай установай (амбулаторыяй, бальніцай і інш.).

Выклік хуткай дапамогі пры такіх захворваннях робіцца супрацоўнікамі міліцыі або пасадавымі асобамі ўстаноў.

2. Хуткая медыцынская дапамога не выязджае ў наступных выпадках:

а) пры ўсякага роду захворваннях, за выключэннем указаных вышэй раптоўных захворванняў, якія здарыліся па-за домам;

б) да асоб, якія знаходзяцца ў становішчы ап'янення, калі толькі яны не адносяцца да катэгорыі асоб, пералічаных у пункце 1;

в) для засведчання і складання актаў аб смерці;

г) пры вострым вар'яцтве буйнага характару;

д) пры наяўнасці аб'ектыўных умоў, указваючых на магчымасць і вялікую мэтазгоднасць дастаўкі пацярпеўшага або захварэўшага ў бальніцу іншымі сродкамі (блізасць бальніцы, пры наяўнасці ўласнага транспарта і т. д.).

УВАГА: Пры адмаўленні ў выездзе хуткай дапамогі ў выпадку, указаным у пункце „д“, павінен быць указан тэлефон бліжэйшага дзяжурнага ўрача паліклінікі.

3. Хуткая медыцынская дапамога аказваецца станцыяй безадкладна ва ўсякі час дня і ночы.

4. Станцыя хуткай дапамогі высылае машыны за перыферыю горада толькі ў мясцовасці, пералічаныя ў асобым спіску, пры ўмове, што праезд туды магчымы для санітарных машын у даны час года. Указаны спісак штогодна зацвярджаецца гарадскім аддзелам аховы здароўя.

5. Хуткая дапамога не выдае ніякіх даведак і пасведчанняў на месцы здарэння і не мае права прапіскі рэцэптаў і выдачы бальнічных лісткоў.

6. Выклік хуткай дапамогі можа рабіцца па тэлефону „Хуткай дапамогі“ або іншых даступных шляхах. Уваход на станцыю хуткай дапамогі без пропуска забараняецца.

На ўсе пытанні дзяжурнага ўрача выклікаючы абавязан даць падрабязныя дакладныя адказы і машыну хуткай дапамогі абавязан сустрэць на вуліцы.

7. Родныя і знаёмыя могуць суправаджаць пацярпеўшага толькі з дазволу ўрача хуткай дапамогі і ў ліку не больш аднаго чалавека.

8. Машыны хуткай дапамогі маюць адрозніваючыя знакі (ліхтар з чырвоным крыжам уперадзе на даху машыны, знак Чырвонага крыжа на шкле перад шоферам) і асобы сігнальны ражок. Персанал машыны мае адрозніваючыя знакі на вопратцы.

9. Машыны хуткай дапамогі карыстаюцца ва ўсіх выпадках першачарговасцю праезду і прыроўніваюцца ў адносінах правіл руху да пажарных машын.

10. Асобы, выклікаўшыя хуткую медыцынскую дапамогу наменавана хлуслівым паведамленнем аб няшчасным здарэнні, або з намераным скажэннем яго характару і значэння, падлягаюць у адміністратыўным парадку штрафу да 100 рублёў або прымусовым работам да 14 сутак.

11. Нагляд за выкананнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на хуткую медыцынскую дапамогу і органы міліцыі.

Старшыня Беластоцкага горвыканкома
І. РАЖНОЎСКІ.

Сакратар Беластоцкага горвыканкома
Ф. ОКУНЬ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—96 Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.